ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______ 20__ № ____

# АДУКАЦЫЙНЫ СТАНДАРТ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
(АСВА 6-05-0322-02-2022)

## АГУЛЬНАЯ ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ
**Спецыяльнасць** 6-05-0322-02 Архіўная справа
**Кваліфікацыя** Гісторык-архівіст. Выкладчык
**Ступень** бакалаўр

## ОБЩЕЕ ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ
**Специальность** 6-05-0322-02 Архивное дело
**Квалификация** Историк-архивист. Преподаватель
**Степень** бакалавр

## GENERAL HIGHER EDUCATION
**Speciality** 6-05-0322-02 Archives
**Qualification** Historian. Archivist. Teacher
**Degree** Bachelor

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Адукацыйны стандарт агульнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-02 Архіўная справа (далей – адукацыйны стандарт) прымяняецца пры распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы бакалаўрыята, вучэбна-метадычнай дакументацыі, вучэбных выданняў, інфармацыйна- аналітычных матэрыялаў.

Дадзены адукацыйны стандарт абавязковы для прымянення ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку па адукацыйнай праграме бакалаўрыята па спецыяльнасці 6-05-0322-02 Архіўная справа.

2. У дадзеным адукацыйным стандарце выкарыстаны спасылкі на наступныя акты заканадаўства:

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 011-2022

«Специальности и квалификации» (далей – АКРБ 011-2022);

Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 005-2011 «Виды экономической деятельности» (далей – АКРБ 005-2011);

СТБ ISO 9000-2015 Сістэмы менеджменту якасці. Асноўныя палажэнні і слоўнік (далей – СТБ ISO 9000-2015);

СТБ ISO 15489-1-2016 Інфармацыя і дакументацыя. Кіраванне дакументамі. Частка 1. Агульныя патрабаванні (далей – СТБ ISO 15489-1-2016);

СТБ 2059-2013 Справаводства і архіўная справа. Тэрміны і азначэнні (далей – СТБ 2059-2013);

СТБ 6.10.1-95 Уніфікаваныя сістэмы дакументацыі Рэспублікі Беларусь. Асноўныя палажэнні (далей – СТБ 6.10.1-95).

3. У дадзеным адукацыйным стандарце прымяняюцца тэрміны, вызначаныя ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, у Законе Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2011 г. № 323-З «Об архивном деле и делопроизводстве в Республике Беларусь», у Законе Рэспублікі Беларусь ад 10 лістапада 2008 г. № 455-З «Об информации, информатизации и защите информации», а таксама наступныя тэрміны з адпаведнымі азначэннямі:

архівазнаўства – комплексная навуковая дысцыпліна, якая распрацоўвае тэарэтычныя, метадычныя і арганізацыйныя пытанні архіўнай справы і яе гісторыю;

базавыя прафесійныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да спецыяліста з агульнай вышэйшай адукацыяй і якія адлюстроўваюць яго здольнасць вырашаць агульныя задачы прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю;

вынікі навучання – веды, уменні і навыкі (досвед), якія асоба, якая навучаецца, можа прадэманстраваць па завяршэнні вывучэння канкрэтнай вучэбнай дысцыпліны або модуля;

дакумент – зафіксаваная на матэрыяльным носьбіце інфармацыя з рэквізітамі, якія дазваляюць яе ідэнтыфікаваць, якая створана, атрымана і захоўваецца арганізацыяй або асобай у доказных або даведачных мэтах у працэсе выканання прававых абавязацельстваў або ажыццяўлення сваёй дзейнасці (СТБ 2059-2013);

забеспячэнне якасці – частка менеджменту якасці, арыентаваная на прадстаўленне ўпэўненасці ў тым, што патрабаванні да якасці будуць выкананы (СТБ ISO 9000-2015);

кампетэнтнасць – здольнасць прымяняць веды і навыкі для дасягнення намечаных вынікаў (СТБ ISO 9000-2015);

прафілізацыя – варыянт рэалізацыі адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці, абумоўлены асаблівасцямі прафесійнай дзейнасці бакалаўра;

спецыялізаваныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў

адпаведнасці з патрабаваннямі да спецыяліста з агульнай вышэйшай адукацыяй і якія адлюстроўваюць яго здольнасць вырашаць спецыялізаваныя задачы прафесійнай дзейнасці з улікам прафілізацыі адукацыйнай праграмы бакалаўрыята ва ўстанове вышэйшай адукацыі;

спецыяльнасць – комплекс або паслядоўнасць відаў прафесійнай дзейнасці, спланаванай і арганізаванай для дасягнення мэт навучання на працягу бесперапыннага (працяглага) прамежку часу і ўключэння выпускніка ўстановы адукацыі ў вызначаныя віды эканамічнай дзейнасці на падставе атрыманай кваліфікацыі (АКРБ 011-2022);

універсальныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да спецыяліста з агульнай вышэйшай адукацыяй і якія адлюстроўваюць яго здольнасць прымяняць базавыя агульнакультурныя веды і ўменні, а таксама сацыяльна-асобасныя якасці, якія адпавядаюць запытам дзяржавы і грамадства.

4. Спецыяльнасць 6-05-0322-02 Архіўная справа ў адпаведнасці з АКРБ 011-2022 адносіцца да профілю адукацыі 03 Сацыяльныя навукі, журналістыка і інфармацыя, напрамку адукацыі 032 Журналістыка і інфармацыя і забяспечвае атрыманне кваліфікацыі «Гісторык-архівіст. Выкладчык» і атрыманне ступені бакалаўра.

5. Навучанне па спецыяльнасці прадугледжвае наступныя формы атрымання агульнай вышэйшай адукацыі: вочная (дзённая, вячэрняя), завочная, дыстанцыйная.

6. Асноўнымі відамі прафесійнай дзейнасці бакалаўра ў адпаведнасці з АКРБ 005-2011 з’яўляюцца:

63 Дзейнасць у галіне інфармацыйнага абслугоўвання;

722 Навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне грамадскіх і гуманітарных навук;

74909 Іншая прафесійная, навуковая і тэхнічная дзейнасць;

821 Дзейнасць у галіне офіснага адміністрацыйнага і дапаможнага абслугоўвання;

84 Дзяржаўнае кіраванне;

853 Сярэдняя адукацыя;

854 Вышэйшая і паслясярэдняя адукацыя;

855 Іншыя віды адукацыі;

856 Дапаможныя адукацыйныя паслугі;

91 Дзейнасць бібліятэк, архіваў, музеяў і іншая дзейнасць у галіне культуры.

Бакалаўр можа ажыццяўляць іншыя віды прафесійнай дзейнасці пры ўмове адпаведнасці ўзроўню яго адукацыі і набытых кампетэнцый патрабаванням да кваліфікацыі работніка.

## ГЛАВА 2
## ПАТРАБАВАННІ ДА ТЭРМІНАЎ АТРЫМАННЯ АГУЛЬНАЙ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

7. Тэрмін атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме складае 4 гады.

Тэрмін атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў вячэрняй форме складае 5 гадоў, у завочнай форме складае – 5 гадоў, у дыстанцыйнай форме –5 гадоў.

8. Пералік спецыяльнасцей сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйныя праграмы па якіх могуць быць інтэграваныя з адукацыйнай праграмай агульнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-02 Архіўная справа, вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

Тэрмін атрымання агульнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-02 Архіўная справа асобамі, якія навучаюцца па адукацыйнай праграме бакалаўрыята, інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, можа быць скарочаны ўстановай вышэйшай адукацыі пры ўмове выканання патрабаванняў дадзенага адукацыйнага стандарта ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Тэрмін навучання па адукацыйнай праграме бакалаўрыята, інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у вячэрняй і завочнай і дыстанцыйнай формах можа быць павялічаны не больш чым на 1 год адносна тэрміну навучання па дадзенай адукацыйнай праграме ў дзённай форме.

9. Працаёмістасць адукацыйнай праграмы бакалаўрыята складае 240 заліковых адзінак.

Сума заліковых адзінак за 1 год навучання пры атрыманні агульнай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме складае 60 заліковых адзінак, пры навучанні па індывідуальным вучэбным плане – не больш за 75 заліковых адзінак. Пры атрыманні агульнай вышэйшай адукацыі ў вячэрняй, завочнай і дыстанцыйнай формах сума заліковых адзінак за 1 год навучання, як правіла, не перавышае 60 заліковых адзінак.

## ГЛАВА 3
## ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ЗАСВАЕННЯ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ БАКАЛАЎРЫЯТА

10. Бакалаўр, які засвоіў змест адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці 6-05-0322-02 Архіўная справа, павінен валодаць універсальнымі, базавымі прафесійнымі і спецыялізаванымі кампетэнцыямі.

11. Бакалаўр павінен валодаць наступнымі ўніверсальнымі

кампетэнцыямі (далей – УК):

УК-1 Валодаць асновамі даследчай дзейнасці, ажыццяўляць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі;

УК-2 Вырашаць стандартныя задачы прафесійнай дзейнасці на аснове прымянення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

УК-3 Ажыццяўляць камунікацыі на замежнай мове для вырашэння задач міжасобаснага і міжкультурнага ўзаемадзеяння;

УК-4 Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;

УК-5 Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці;

УК-6 Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да зменаў у прафесійнай дзейнасці;

УК-7 Валодаць здольнасцю аналізаваць працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды, выяўляць фактары і механізмы гістарычных змен, вызначаць сацыяльна-палітычнае значэнне гістарычных падзей (асоб, артэфактаў і сімвалаў) для сучаснай беларускай дзяржаўнасці, у дасканаласці выкарыстоўваць выяўленыя заканамернасці ў працэсе фарміравання грамадзянскай ідэнтычнасці;

УК-8 Валодаць здольнасцю аналізаваць эканамічную сістэму грамадства ў яе дынаміцы, законы яе функцыянавання і развіцця для разумення фактараў узнікнення і напрамкаў развіцця сучасных сацыяльна-эканамічных сістэм, іх здольнасці задавальняць патрэбы людзей, выяўляць фактары і механізмы палітычных і сацыяльна-эканамічных працэсаў, выкарыстоўваць інструменты эканамічнага аналізу для ацэнкі палітычнага працэсу прыняцця эканамічных рашэнняў і рэзультатыўнасці эканамічнай палітыкі

УК-9 Валодаць сучаснай культурай мыслення, гуманістычным светапоглядам, аналітычным і інавацыйна-крытычным стылем пазнавальнай, сацыяльна-практычнай і камунікатыўнай дзейнасці, выкарыстоўваць асновы філасофскіх ведаў у непасрэднай прафесійнай дзейнасці, самастойна засвойваць філасофскія веды і выбудоўваць на іх падставе светапоглядную пазіцыю;

УК-10 Выяўляць фактары і механізмы гістарычнага развіцця, вызначаць грамадскае значэнне гістарычных падзей;

УК-11 Прымяняць тэарэтычныя падыходы і методыкі пры фарміраванні Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь і выкарыстанні рэтраспектыўнай дакументнай інфармацыі ў інтарэсах грамадства і асобы;

УК-12 Выкарыстоўваць традыцыйныя і інавацыйныя педагагічныя тэхналогіі і метады навучання ў адукацыйным працэсе;

УК-13 Валодаць дзяржаўнымі мовамі для ажыццяўлення

прафесійнай камунікацыі, падрыхтоўкі навуковых тэкстаў;

УК-14 Аналізаваць і ацэньваць сацыяльна-значныя з’явы, падзеі, працэсы, праяўляць прадпрымальніцкую ініцыятыву і рэалізоўваць навуковыя, тэхнічныя, сацыяльныя інавацыі;

УК-15 Валодаць навыкамі здароўезберажэння;

УК-16 Валодаць здольнасцю аналізаваць палітычныя падзеі, працэсы, адносіны, валодаць культурай палітычнага мыслення і паводзін, выкарыстоўваць асновы паліталагічных ведаў для фарміравання культуры ўсвядомленага і рацыянальнага палітычнага выбару, сцвярджэння сацыяльна арыентаваных каштоўнасцей;

УК-17 Мець магчымасць аналізаваць працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, ажыццяўляць іх сацыялагічную дыягностыку, прагназаваць, апярэджваць ці мінімізаваць наступствы крызісных з'яў у розных сферах жыцця;

УК-18 Валодаць здольнасцю аналізаваць працэсы і з’явы нацыянальнай і сусветнай культуры, наладжваць міжасобаснае ўзаемадзеянне з улікам сацыяльна-культурных асаблівасцей, этнічных і канфесійных адрозненняў;

12. Бакалаўр павінен валодаць наступнымі базавымі прафесійнымі кампетэнцыямі (далей – БПК):

БПК-1 Выяўляць і аналізаваць заканамернасці развіцця архіўнай справы на Беларусі і фарміравання Нацыянальнага архіўнага фонда Рэспублікі Беларусь;

БПК-2 Інтэрпрэтаваць прававыя і арганізацыйныя асновы дзейнасці архіваў, абгрунтоўваць прынцыпы дзейнасці архіўных устаноў і органаў кіравання справаводствам і архіўнай справай на сучасным этапе;

БПК-3 Камплектаваць, апрацоўваць, улічваць розныя віды фондаў (калекцый) і забяспечваць іх захаванасць;

БПК-4 Распрацоўваць уніфікаваныя сістэмы дакументацыі, уніфікаваныя формы дакументаў уліку архіўных фондаў (калекцый);

БПК-5 Ажыццяўляць аналітыка-сінтэтычную апрацоўку дакументаў з выкарыстаннем традыцыйных і інавацыйных тэхналогій, арганізоўваць і суправаджаць навукова-даведачны апарат архіва;

БПК-6 Арганізоўваць работу з рознымі катэгорыямі наведвальнікаў (карыстальнікаў), у тым ліку з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій;

БПК-7 Валодаць класічнай мовай на ўзроўні дастатковым для разумення і інтэрпрэтацыі гістарычных крыніц;

БПК-8 Выяўляць і аналізаваць заканамернасці развіцця беларускага грамадства і культуры ў кантэксце сусветных цывілізацый на розных гістарычных этапах;

БПК-9 Прымяняць метады крыніцазнаўчага аналізу і спецыяльных

гістарычных дысцыплін, апісання дакументнай рэтраспектыўнай інфармацыі ў даследчых і агульнапрафесійных мэтах;

БПК-10Арганізоўваць выкарыстанне архіўных дакументаў у выкладанні гістарычных і сацыяльна-палітычных дысцыплін;

БПК-11Прымяняць асноўныя метады аховы вытворчага персаналу і насельніцтва ад негатыўных уздзеянняў фактараў антрапагеннага, тэхнагеннага, натуральнага паходжання, прынцыпы рацыянальнага прыродакарыстання і энергазберажэння, забяспечваць здаровыя і бяспечныя ўмовы працы.

13. Пры распрацоўцы зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці на аснове дадзенага адукацыйнага стандарта ўсе УК і БПК уключаюцца ў набор патрабуемых вынікаў засваення зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыята ў адпаведнасці з дадзеным адукацыйным стандартам.

14. Пры распрацоўцы зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці ўстанова вышэйшай адукацыі прафілізуе адукацыйную праграму бакалаўрыята з улікам патрэб рынку працы і перспектывамі развіцця галіны.

Найменне прафілізацыі вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі самастойна і можа ўключацца ў найменні прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці.

15. Пералік вызначаных дадзеным адукацыйным стандартам УК можа быць дапоўнены ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам прафілізацыі адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці, асаблівасцей прафесійнай дзейнасці будучага бакалаўра.

Пералік спецыялізаваных кампетэнцый ўстанова вышэйшай адукацыі вызначае самастойна з улікам прафілізацыі адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці, асаблівасцей прафесійнай дзейнасці будучага бакалаўра.

Дадатковыя УК і спецыялізаваныя кампетэнцыі вызначаюцца на аснове патрабаванняў рынку працы, абагульнення замежнага вопыту, правядзення кансультацый з арганізацыямі, якія маюць патрэбу ў падрыхтоўцы бакалаўраў, іншых крыніц.

Сукупнасць вызначаных дадзеным адукацыйным стандартам УК і БПК, а таксама вызначаных установай вышэйшай адукацыі дадатковых УК і спецыялізаваных кампетэнцый, павінна забяспечваць бакалаўру здольнасць ажыццяўляць не менш чым адзін від прафесійнай дзейнасці, вызначаны ў пункце 6 дадзенага адукацыйнага стандарта.

# ГЛАВА 4
# ПАТРАБАВАННІ ДА ЗМЕСТУ ВУЧЭБНА-ПРАГРАМНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ БАКАЛАЎРЫЯТА

16. Вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці распрацоўваецца ў адпаведнасці са структурай, прыведзенай у табліцы 1.

Табліца 1

| № п/п | Найменне відаў дзейнасці асобы, якая навучаецца, модуляў, вучэбных дысцыплін | Працаёмістасць (у залікових адзінках) |
|---|---|---|
| **1.** | **Тэарэтычнае навучанне** | **189–211** |
| 1.1. | Дзяржаўны кампанент: Сацыяльна-гуманітарны модуль (Гісторыя беларускай дзяржаўнасці, Сучасная палітэканомія, Філасофія); модуль “Айчынная гісторыя” (Гісторыя Беларусі); модуль “Архівазнаўства Беларусі” (Гісторыя і арганізацыя архіўнай справы ў Беларусі, Тэорыя і методыка архіўнай справы Беларусі, Інфарматызацыя архіўнай справы Беларусі); модуль “Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя навукі” (Крыніцазнаўства, Беларуская палеаграфія, спецыяльныя гістарычныя навукі (Дыпламатыка, Генеалогія і геральдыка, Сфрагістыка); Лінгвістычны модуль (Замежная мова (агульнае валоданне), Лацінская мова); Модуль псіхолага-педагагічнага напрамку (Узроставая педагогіка, Узроставая псіхалогія, Методыка выкладання гісторыі ў сярэдняй школе); модуль “Курсавая работа” | 81–122 |
| 1.2. | Кампанент установы вышэйшай адукацыі | 98–130 |
| **2.** | **Вучэбная практыка** | **3–9** |
| **3.** | **Вытворчая практыка** | **18–26** |
| **4.** | **Дыпломнае праектаванне** | **8–16** |
| | **Усяго** | **240** |

17. Максімальны аб’ём вучэбнай нагрузкі асобы, якая навучаецца, не павінен перавышаць 54 акадэмічныя гадзіны ў тыдзень, уключаючы ўсе віды аўдыторнай і пазааўдыторнай работы, акрамя дадатковых відаў навучання.

Аб’ём абавязковых аўдыторных заняткаў, які вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам спецыяльнасці, спецыфікі арганізацыі адукацыйнага працэсу, аснашчэння вучэбна-лабараторнай базы, інфармацыйнага, навукова-метадычнага забеспячэння, вызначаецца ў межах 24–32 аўдыторных гадзін у тыдзень.

У гадзіны, якія адводзяцца на самастойную работу па вучэбнай дысцыпліне, модулі, уключаецца час, прадугледжаны на падрыхтоўку да экзамену (экзаменаў) і (або) заліку (залікаў) па дадзенай вучэбнай дысцыпліне, модулі.

18. Размеркаванне працаёмістасці паміж асобнымі модулямі і

вучэбнымі дысцыплінамі дзяржаўнага кампанента, а таксама асобнымі відамі вучэбных і вытворчых практык ажыццяўляецца ўстановай вышэйшай адукацыі.

19. Найменні вучэбных і вытворчых практык вызначаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам асаблівасцей прафесійнай дзейнасці бакалаўра.

У вучэбным плане неабходна прадугледзець праходжанне вучэбнай (азнаямленчай) практыкі на першым курсе навучання.

20. Працаёмістасць кожнай вучэбнай дысцыпліны павінна складаць не менш за тры заліковыя адзінкі. Адпаведна, працаёмістасць кожнага модуля павінна складаць не менш за шэсць заліковых адзінак.

21. Пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці рэкамендуецца прадугледжваць у рамках кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі модулі і вучэбныя дысцыпліны па выбары асобы, якая навучаецца, у аб’ёме не менш чым 15 працэнтаў ад кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі.

22. Коды УК і БПК, фарміраванне якіх забяспечваюць модулі і вучэбныя дысцыпліны дзяржаўнага кампанента, пазначаны ў табліцы 2.

Табліца 2

| № п/п | Найменне модуляў, вучэбных дысцыплін | Коды фарміруемых кампетэнцый |
|---|---|---|
| **1.** | **Сацыяльна-гуманітарны модуль** | |
| 1.1. | Гісторыя беларускай дзяржаўнасці | УК-7 |
| 1.2. | Сучасная палітэканомія | УК-8 |
| 1.3. | Філасофія | УК-9 |
| **2.** | **Модуль “Айчынная гісторыя”** | **УК-4,10; БПК-10** |
| 2.1 | Гісторыя Беларусі | |
| **3.** | **Модуль “Архівазнаўства Беларусі”** | **УК-1,2,5,6,11; БПК-1-6** |
| 3.1 | Тэорыя і методыка архіўнай справы Беларусі | |
| 3.2 | Тэорыя і методыка архіўнай справы Беларусі | |
| 3.3 | Інфарматызацыя архіўнай справы Беларусі | |
| **4.** | **Модуль “Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя навукі”** | **УК-1; БПК-9** |
| 4.1 | Крыніцазнаўства | |
| 4.2 | Беларуская палеаграфія | |
| 4.3 | Спецыяльныя гістарычныя навукі | |
| 4.3.1 | Дыпламатыка | |
| 4.3.2 | Генеалогія і геральдыка | |
| 4.3.3 | Сфрагістыка | |
| **5.** | **Лінгвістычны модуль** | |
| 5.1. | Замежная мова (агульнае валоданне) | УК-3 |
| 5.2. | Лацінская мова | БПК-7 |
| **6.** | **Модуль псіхолага-педагагічнага напрамку** | **УК-5,12; БПК-10** |

| № п/п | Найменне модуляў, вучэбных дысцыплін | Коды фарміруемых кампетэнцый |
|---|---|---|
| **7.** | **Модуль “Курсавая работа”** | **УК-1,2,13; БПК-1, 2** |

23. Вынікі навучання па вучэбных дысцыплінах, модулях (ведаць, умець, мець навык) вызначаюцца вучэбнымі праграмамі.

24. У прыкладных вучэбных праграмах па вучэбных дысцыплінах, модулях прыводзіцца прыкладны пералік вынікаў навучання.

25. Вынікі навучання павінны быць суаднесены з патрабаванымі вынікамі засваення зместу адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці (кампетэнцыямі).

26. Сукупнасць запланаваных вынікаў навучання павінна забяспечваць выпускніку фарміраванне УК і БПК, вызначаных дадзеным адукацыйным стандартам, а таксама дадатковых УК і спецыялізаваных кампетэнцый, вызначаных установай вышэйшай адукацыі самастойна.

## ГЛАВА 5
## ПАТРАБАВАННІ ДА АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

27. Педагагічныя работнікі, якія забяспечваюць рэалізацыю адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці, павінны:

займацца навукова-метадычнай дзейнасцю;

валодаць сучаснымі адукацыйнымі, у тым ліку інфармацыйнымі тэхналогіямі, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага працэсу;

валодаць асобаснымі якасцямі і кампетэнцыямі, якія дазваляюць эфектыўна арганізоўваць вучэбную і выхаваўчую работу са студэнтамі, курсантамі, слухачамі.

Для ажыццяўлення адукацыйнага працэсу могуць прыцягвацца спецыялісты рэальнага сектара эканомікі, дзейнасць якіх звязана са спецыяльнасцю агульнай вышэйшай адукацыі, у адпаведнасці з заканадаўствам.

28. Установа вышэйшай адукацыі павінна мець:

матэрыяльна-тэхнічную базу, неабходную для арганізацыі адукацыйнага працэсу, самастойнай работы і развіцця асобы студэнта, курсанта, слухача;

сродкі навучання, неабходныя для рэалізацыі адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці (прыборы, абсталяванне, інструменты, вучэбна-наглядныя дапаможнікі, камп’ютары, камп’ютарныя сеткі, аўдыёвізуальныя сродкі і іншыя матэрыяльныя аб’екты).

Функцыянаванне інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя ўстановы вышэйшай адукацыі забяспечваецца адпаведнымі сродкамі інфармацыйна-

камунікацыйных тэхналогій і павінна адпавядаць заканадаўству.

Асобы, якія навучаюцца, з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця павінны быць забяспечаны адаптаванымі друкаванымі і (або) электроннымі адукацыйнымі рэсурсамі.

29. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу павінна адпавядаць наступным патрабаванням:

вучэбныя дысцыпліны, модулі павінны быць забяспечаны сучаснай вучэбнай, даведачнай, іншай літаратурай, вучэбнымі праграмамі, вучэбна-метадычнай дакументацыяй, інфармацыйна-аналітычнымі матэрыяламі, у тым ліку ў электронным выглядзе;

павінен быць забяспечаны доступ для кожнага студэнта, курсанта, слухача да бібліятэчных фондаў, электронных сродкаў навучання, электронных інфармацыйных рэсурсаў (лакальнага доступу, аддаленага доступу) па ўсіх вучэбных дысцыплінах, модулях.

Навукова-метадычнае забеспячэнне павінна быць арыентавана на распрацоўку і ўкараненне ў адукацыйны працэс інавацыйных адукацыйных тэхналогій, адэкватных кампетэнтнаснаму падыходу (крэатыўнага і дыялогавага навучання, варыятыўных мадэляў самастойнай работы, модульных і рэйтынгавых сістэм навучання, тэставых і іншых сістэм ацэньвання ўзроўню кампетэнцый і іншае).

Абавязковым элементам навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу з’яўляецца размешчаны на афіцыйным сайце ўстановы вышэйшай адукацыі ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт каталог вучэбных дысцыплін, модуляў, які адпавядае наступным патрабаванням:

уключае ў сябе зручную ў выкарыстанні і актуальную інфармацыю, даступную для абітурыентаў на этапе ўступнай кампаніі, а таксама для студэнтаў, курсантаў, слухачоў на працягу ўсяго перыяду навучання;

прадстаўляецца на рускай і (або) беларускай мове і англійскай мове;

апісанне кожнай вучэбнай дысцыпліны, модуля змяшчае кароткі змест, фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання (ведаць, умець, мець навык), семестр, перадрэквізіты, працаёмістасць у заліковых адзінках (крэдытах), колькасць аўдыторных гадзін і самастойнай работы, патрабаванні да бягучай і прамежкавай атэстацыі і яе формы;

аб’ём апісання кожнай вучэбнай дысцыпліны, модуля складае максімум адну старонку;

каталог вучэбных дысцыплін, модуляў суправаджаецца структурнай (структурна-лагічнай) схемай адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці з заліковымі адзінкамі.

Установы вышэйшай адукацыі маюць права самастойна прымаць рашэнне аб фармаце каталога вучэбных дысцыплін, модуляў і паслядоўнасці прадстаўлення інфармацыі.

30. Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы вызначаюцца заканадаўствам.

31. Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы вызначаюцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўстановах вышэйшай адукацыі і праграмна-плануючай дакументацыяй выхавання.

32. Канкрэтныя формы і працэдуры бягучай і прамежкавай атэстацыі па кожнай вучэбнай дысцыпліне распрацоўваюцца адпаведнай кафедрай установы вышэйшай адукацыі і адлюстроўваюцца ў вучэбных праграмах установы адукацыі па вучэбных дысцыплінах, модулях.

Для забеспячэння бягучай і прамежкавай атэстацыі асоб, якія навучаюцца, ствараюцца фонды ацэначных сродкаў, якія ўключаюць тыпавыя заданні, заданні адкрытага тыпу, заданні камунікатыўнага тыпу, кантрольныя работы, тэсты, комплексныя кваліфікацыйныя заданні, тэматыку курсавых праектаў (курсавых работ), метадычныя распрацоўкі па інавацыйных формах навучання і кантролю за фарміраваннем кампетэнцый, тэматыку і прынцыпы складання эсэ, формы анкет для правядзення самаацэнкі кампетэнцый асоб, якія навучаюцца, і іншае. Фонды ацэначных сродкаў распрацоўваюцца адпаведнымі кафедрамі ўстановы вышэйшай адукацыі.

Ацэначнымі сродкамі павінна прадугледжвацца ацэнка здольнасці асоб, якія навучаюцца, весці пошук вырашэння новых задач, звязаных з недастатковасцю канкрэтных спецыяльных ведаў і адсутнасцю агульнапрынятых алгарытмаў.

## ГЛАВА 6
## ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКОВАЙ АТЭСТАЦЫІ

33. Выніковая атэстацыя ажыццяўляецца дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй.

Да выніковай атэстацыі дапускаюцца студэнты, курсанты, слухачы, якія цалкам выканалі адпаведныя вучэбны план і вучэбныя праграмы.

Выніковая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні адукацыйнай праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасці 6-05-0322-02 Архіўная справа праводзіцца ў форме дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці і абароны дыпломнай работы.

Пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі фарміруюцца або развіваюцца кампетэнцыі, прыведзеныя ў табліцы 2 дадзенага адукацыйнага стандарта.

34. Праграма дзяржаўнага экзамену распрацоўваецца ўстановай вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм

вышэйшай адукацыі.

Патрабаванні да структуры, зместу, аб'ёму і парадку абароны дыпломнай работы вызначаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі на аснове дадзенага адукацыйнага стандарта і Правілаў правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

Тэматыка дыпломных работ павінна вызначацца актуальнасцю і практычнай значнасцю.

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
А.Д.Кароль

___ ___ 2022

Старшыня ВМА па гуманітарнай адукацыі
А.Г.Прахарэнка

___ ___ 2022

Кіраўнік калектыву распрацоўшчыкаў адукацыйнага стандарта

Загадчык кафедры крыніцазнаўства
С.М.Ходзін

___ ___ 2022

Члены калектыву распрацоўшчыкаў адукацыйнага стандарта

Першы намеснік дырэктара Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь
В.А.Ледаўская

___ ___ 2022

Дацэнт кафедры гісторыі крыніцазнаўства
З.В.Антановіч

___ ___ 2022

Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу
А.В.Бурачонак

___ ___ 2022

Старшы выкладчык кафедры крыніцазнаўства
А.М.Назаранка

___ ___ 2022

Рэктар Дзяржаўнай установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»
Ю.П.Бондар

___ ___ 2022